Крывічаніна, К. А. Міжнародныя сувязі гісторыкаў-архівістаў (1991—2005 гг.) / К. А. Крывічаніна // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў ХХ—ХХІ ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 210- 216

**К. А. КРЫВІЧАНІНА (Мінск)**

# МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ ГІСТОРЫКАЎ-АРХІВІСТАЎ (1991—2005 гг.)

Пачатак 90-х гг. мінулага стагоддзя азнаменаваўся буйнымі палітычнымі зменамі на тэрыторыі Усходняй Еўропы, якія выклікалі пераўтварэнні ва ўсіх сферах жыцця грамадства, у тым ліку і культурна-гістарычнай. У сувязі з распадам СССР перад архіўнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь паўсталі ранней невядомыя праблемы, сярод якіх найбольш важнай было аднаўленне страчаных сувязей. Некалі адзіны архіўны комплекс па волі лёсу апынуўся падзеленым паміж новымі незалежнымі дзяржавамі (у яго складзе гістарычныя дакументы, у якіх асвятляецца мінулае Беларусі, цесна звязанае з Полацкім княствам, Вялікім княствам Літоўскім, Рэччу Паспалітай, Расійскай імперыяй, Савецкім Саюзам). Калі раней беларускі даследчык не меў праблем з доступам да дакументальнай спадчыны, што захоўвалася ў архівах Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Львова, Вільні і нават Варшавы або Кракава, то ў пачатку 1990-х такія праблемы паўсталі востра. Гісторык з Беларусі для архіўных устаноў Масквы, Кіева, Вільні ператварыўся ў замежнага грамадзяніна. Вось чаму для супрацоўнікаў нацыянальных архіўных устаноў аднаўленне парушаных кантактаў з калегамі з аналагічных арганізацый краін СНД, Літвы і Польшчы набыло вялікую актуальнасць.



Першым крокам на шляху станаўлення міжнародных стасункаў стала наладжванне супрацоўніцтва з краінамі СНД. 6 ліпеня 1992 г. кіраўнікі краінудзельніц СНД, сярод якіх і Беларусь, падпісалі Дамову аб правапераемнасці ў адносінах дзяржаўных архіваў былога СССР, якая стала зыходным пунктам развіцця ўзаемадзеяння ў архіўнай сферы [1, 15]. Яна гарантавала права доступу даследчыкаў да дакументаў і атрыманне копій, правядзенне рэгулярных кансультацый на шматбаковай ці двухбаковай аснове для абмеркавання пытанняў супрацоўніцтва, зафіксавала права ўдзельнікаў Дамовы на вяртанне фондаў, якія ўтварыліся на іх тэрыторыі і ў розны час апынуліся за іх межамі. У студзені 1997 г. было падпісана Пагадненне аб развіцці супрацоўніцтва. Традыцыйнымі сталі нарады кіраўнікоў дзяржаўных архіўных службаў краін-удзельніц. На чарговай з іх, што адбылася 26 лістапада 1997 г. у Маскве, абмяркоўваліся прадстаўленыя Федэратыўнай архіўнай службай Расіі праект «Дамовы аб прынцыпах і формах узаемадзеяння краін СНД у галіне выкарыстання архіўнай інфармацыі» і праект аўтаматызацыі цэнтральных фондавых каталогаў. Апошняя нарада Савета адбылася ў г. Львове ў верасні 2005 г., дзе былі абмеркаваны пытанні аб выкананні ўнутрыдзяржаўных працэдур па ўступленні ў сілу Рашэння аб стварэнні Савета, якое было прынята ў Маскве 3 снежня 2004 г., аб дзейнасці УНДІДАС як базавай арганізацыі па перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў і г. д. [2, 6]

З мэтай павышэння эфектыўнасці міждзяржаўных стасункаў у рамках СНД падпісваліся двухбаковыя і трохбаковыя пагадненні. Так, у 1999 г. была заключана міжнародная Дамова «Аб супрацоўніцтве паміж Беларускім навуковадаследчым інстытутам дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС), Усерасійскім навукова-даследчым інстытутам дакументазнаўства і архіўнай справы і Украінскім дзяржаўным навукова-даследчым інстытутам архіўнай справы і дакументазнаўства» [3, 15].

Найбольш цесныя кантакты былі наладжаны з Расійскай Федэрацыяй. Узаемаадносіны паміж Расархівам і Белкамархівам будаваліся на аснове Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Федэральнай архіўнай службай Расіі і Дзяржаўным камітэтам па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь 1997 г. Вынікам сумеснай работы з’явілася распрацоўка Палажэння аб Каардынацыйным савеце дзяржаўных архіўных службаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, прынящце планаў сумесных дзеянняў. Архіўнымі службамі Расіі і Беларусі быў распрацаваны шэраг камп’ютэрных тэхналогій, назапашаны значныя аўтаматызаваныя інфармацыйныя масівы. Функцыянуюць сайты Расархіва і Белкамархіва [4, 1].

Кіраўнікі Дзяржкамархіва, БелНДІДАС прымалі ўдзел у пасяджэннях калегій Расархіва, яго Навуковага савета, міжнародных канферэнцыях. На су-

польных пасяджэннях разглядаліся пытанні ўніфікацыі і збліжэння заканадаўчай і нарматыўнай базы архіўных службаў абедзвюх дзяржаў, пытанні паглыблення супрацоўніцтва паміж БелНДІДАС і УНДІАСД. Асаблівая ўвага надавалася абмену інфармацыяй па прыярытэтным накірункам дзейнасці: фарміраванне архіўных фондаў, забеспячэнне захаванасці архіўных дакументаў і арганізацыя дзяржаўнага ўліку, арганізацыя стажыровак спецыялістаў, укараненне аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, удзел у міжнародных арганізацыях. Аднак міждзяржаўныя праграмы не рэалізоўваліся ў поўнай меры, што было абумоўлена недахопам фінансавых сродкаў. Напрыклад, па Плане сумесных дзеянняў на 2001—2003 гг. у 2002 г. прадугледжвалася актыўная ўзаемная стажыроўка беларускіх і расійскіх спецыялістаў, аднак толькі адзін супрацоўнік з Цэнтра дакументацыі навейшай гісторыі Смаленскай вобласці прайшоў стажыроўку ў ліпені 2002 г. у НАРБ. Камітэт па архівах і справаводстве не змог накіраваць беларускіх архівістаў [4, 2]. 29 верасня 1992 г. зацверджана «Пагадненне паміж Галоўнай дырэкцыяй дзяржаўных архіваў Польшчы і Галоўным архіўным упраўленнем пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь». Згодна з ім бакі абавязаліся інфармаваць адзін аднаго пра архіўныя матэрыялы, што маюць для іх інтарэс. Наступная сустрэча адбылася толькі ў сакавіку 2003 г., калі па запрашэнні Генеральнай дырэкцыі беларускія прадстаўнікі знаходзіліся з афіцыйным візітам у Польшчы. У ходзе перамоў было заключана пагадненне па абмене супрацоўнікамі, садзейнічанні ў доступе да архіўных дакументаў, ажыццяўленні сумесных публікацый па гісторыі адносін Польшчы і Беларусі.

З 3 па 5 мая 1999 г. у Архіўным дэпартаменце Літоўскай Рэспублікі прайшло абмеркаванне асноўных напрамкаў супрацоўніцтва паміж архіўнымі службамі Літвы і Беларусі. У выніку быў падпісаны Пратакол, які прадугледжваў абмен дэлегацыямі, нарматыўнымі актамі, рэгулюючымі дзейнасць дзяржаўных архіўных службаў, а таксама інфармацыйнымі выданнямі аб складзе архіўных фондаў. З 7 па 9 красавіка 2003 г. з дзелавым візітам у г. Мінску знаходзілася дэлегацыя прадстаўнікоў дзяржаўных архіваў Літвы. Абмяркоўваліся перспектывы далейшага развіцця супрацоўніцтва паміж архівамі дзвюх краін, разглядаліся магчымасці рэалізацыі шэрага сумесных праектаў [5, 129]. З 28 па 30 мая 2002 г. у Берліне прайшло пасяджэнне беларуска-германскай Змешанай камісіі па культурным супрацоўніцтве. Удзельнікі сустрэчы віталі падпісанне 29 красавіка Пагаднення аб выяўленні лёсаў савецкіх і нямецкіх ваеннапалонных перыяду Другой сусветнай вайны, вынікам якога стала сумесная падрыхтоўка даведнікаў па адпаведнай тэматыцы [6, 133].

У другой палове 1990-х гг. распачалося больш шырокае занёмства з гісторыяй і арганізацыяй архіўнай справы Францыі. Былі арганізаваны беларуска-



французскія архіўныя семінары, што дало магчымасць даследаваць асноўныя прынцыпы архівістыкі Францыі. Наладжана супрацоўніцтва з іншымі замежнымі ўстановамі, як з дзяржаўнымі так і недзяржаўнымі. Напрыклад, для праваахоўных органаў Аўстраліі і Канады архівы рэспублікі выявілі і перадалі дакументы аб ваенных злачынствах на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.

Новыя магчымасці нарошчвання сувязей з архіўнымі ўстановамі далёкага замежжа абумоўлены і знаходжаннем Беларусі ў Міжнародным савеце архіваў. Прадстаўнікі нашай краіны сістэматычна ўдзельнічаюць у пасяджэннях круглага стала згаданай арганізацыі. На міжнародным 14-м кангрэсе архівістаў, што прайшоў у Севільі ў 2000 г., было прынята рашэнне аб стварэнні ў рамках Еўропы рускамоўнай групы архівістаў, аб’яднаных перш за ўсё СНД, Балтыяй і некаторымі краінамі азіяцкага рэгіёна. Асноўнымі мэтамі аддзялення (скарочаная назва якога «Еўразіка») стала ўстанаўленне, падтрымка і развіццё сувязей паміж нацыянальнымі архіўнымі службамі рэгіёна, падтрымка мерапрыемстваў па захаванні і абароне архіўнай спадчыны рэгіёна, паляпшэнне прафесійнай падрыхтоўкі архівістаў, арганізацыя канферэнцый, семінараў, сімпозіумаў па пэўнай тэматыцы і інш. [7, 85—89]. З 2000 г. аддзяленнем былі праведзены такія міжнародныя канферэнцыі, як «Архівы і грамадства сёння» (Мінск, 2003 г.), «Прававыя праблемы архіўнай справы ў Еўраазіяцкім рэгіёне» (Астана, 2002 г.), навукова-практычная канферэнцыя па пытаннях работы з аўдыёвізуальнымі дакументамі (Масква, 2001 г.) і г. д. Пад эгідай «Еўразікі» была распачата работа па стварэнні электроннай базы дадзеных «Архіўнае заканадаўства краін еўраазіяцкага рэгіёна». Тэарэтычныя магчымасці аддзялення вялікія і могуць мець значную карысць для краін — удзельніц арганізацыі. Аднак аддзяленне ўвесь час адчувае недахоп фінансавання, што зніжае

эфектыўнасць дзейнасці «Еўразікі». У аддзяленні адсутнічаюць членскія ўзносы, таму Міжнародны савет ажыццяўляе пастаянную падтрымку сустрэч і канферэнцый «Еўразікі»

Пасля распаду СССР па-новаму загучала пытанне рэстытуцыі страчаных каштоўнасцей. Асаблівасці гістарычнага шляху вялі да таго, што вялізная колькасць дакументаў, якія тычацца гісторыі краіны, зараз знаходзіцца ў архівах Польшчы, Расіі, Украіны, Літвы і іншых краін. Доступ да гістарычнай інфармацыі, што змяшчаецца ў гэтых дакументах, жыццёва неабходны для развіцця нашай культуры, навукі, нацыянальнай самасвядомасці. Першы раз пытанне было ўзнята ў 1992 г. падчас сустрэчы прэзідэнтаў 11 дзяржаў — былых рэспублік Саюза. У гэты час быў падпісаны дагавор «Аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнасцей дзяржавам іх паходжання». Аднак гэта пагадненне не было зацверджана Вярхоўным Саветам Расійскай Федэрацыі і таму ў сілу ў Расіі не ўступіла. Гэта практычна прывяло да блакіроўкі магчымасці сумесна-



га вырашэння праблемы рэпатрыяцыі. Аднак, нягледзячы на цяжкасці, пытанне не згубіла сваёй актуальнасці. Аб гэтым сведчаць матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Замежная архіўная беларусіка» (Мінск, 1996 г.) і канферэнцыі «Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей» (Мінск, 1997 г.), на якіх разглядаліся прававыя аспекты сумеснага выкарыстання каштоўнасцей [8, 13]. У той жа час перамяшчэнне ў Беларусь арыгіналаў дакументаў застаецца нявырашаным і выйсце з такой складанай сітуацыі многія бачаць у сучасных інфармацыйных тэхналогіях. Калі немагчыма вярнуць у Беларусь арыгіналы дакументаў, то трэба вярнуць хаця б інфармацыю, шляхам пераносу яе на новыя носьбіты. Ыратавальным сродкам становіцца капіраванне і мікрафільмаванне архіўных дакументаў.

Прыкладам такога супрацоўніцтва паміж даследчыкамі Беларусі і Польшчы стаў абмен фотакопіямі дакументаў з архіва Радзівілаў. У Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве ажыццявілі мікрафільмаванне дакументаў Метрыкі ВКЛ. Дзякуючы гэтаму карыстальнікамі была атрымана магчымасць знаёміцца з матэрыяламі фонда ў архівах Кіева, Мінска, Вільні, куды былі перададзены яго копіі. Яшчэ адным прыкладам можа служыць Радзівілаўскі летапіс, арыгінал якога захоўваецца ў Санкт-Пецярбурзе. Спачатку было створана яго факсімільнае выданне, а потым — электронная копія [9, 43].

Найбольш пашыранай формай міжнароднага супрацоўніцтва гісторыкаўархівістаў стала арганізацыя канферэнцый, круглых сталоў, семінараў. Цэлы шэраг падобных навуковых сустрэч, асноўнай тэматыкай якіх стала праблема развіцця архіўнай справы і дакументазнаўства, быў арганізаваны беларускімі спецыялістамі. Вось некаторыя з іх: міжнародная канферэнцыя «Архівазнаўства, крыніцазнаўства і гістарыяграфія Беларусі: стан і перспектывы» (1994 г.), канферэнцыя «Архівы Беларусі на рубяжы XX—XXI ст. » (2000 г.), беларуска-французскія архіўныя семінары (1997 г., 2000 г.), «Замежная архіўная беларусіка» (1996 г.), «Праблемы беларускай археаграфіі: да 175-годдзя выхаду ў свет «Беларускага архіва старажытных грамат» (1999 г.), «Беларуска-польскія архіваліі: стан і перспектывы» (2001 г.), навукова-практычны семінар «Інфармацыйныя тэхналогіі ў архіўнай справе» (2005 г.), навукова-практычны семінар «Інфармацыйныя тэхналогіі ў галіне дакументазнаўства і архіўнай справы» (2005 г.). Галоўнымі арганізатарамі сустрэч сталі тыя ўстановы, што з’яўляюцца флагманамі беларускага архівазнаўства і дакументазнаўства: Дзяржаўны камітэт па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы, Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Актыўны ўдзел вучоныя Беларусі прымалі і ў іншых семінарах і канферэнцыях, што праводзіліся за межамі краіны: «Дакументацыя ў інфармацыйным



грамадстве: заканадаўства і стандарты» (Масква, 2003 г.), практычны семінар «Стандарты архіўнага апісання» (Масква, 2005 г.), міжнародная навуковая канферэнцыя «Архівы і краязнаўства: шляхі інтэграцыі» (Трускавец, 2003 г.), беларуска-польская архіўная канферэнцыя ў Познані (2000 г.), канферэнцыя «Электронныя дакументы і архівы: тэорыя і практыка» (Масква, 1999 г.), «Нацыянальная архіўная спадчына: праблемы захавання» (Кіеў, 2000 г.), міжнародныя архіўныя канферэнцыі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы («Архівы ў грамадстве», «Калоквіум Ежы Скаўронка», «Роля архіваў у інфармацыйным грамадстве», «Выкананне архіўных матэрыялаў з пункту гледжання Закону і практыкі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы» і г. д.), беларуска-польскія сустрэчы «Шлях да ўзаемнасці» і многіх іншых.

Дастаткова плённым з’яўляецца міжнароднае ўзаемадзеянне архівістаў па падрыхтоўцы міжархіўных і тэматычных даведнікаў. У 1995 г. была падпісана Дамова з Цэнтральным архівам Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы аб выданні дакументаў аб Заходняй Беларусі. З Берлінскім свабодным універсітэтам было дамоўлена аб падрыхтоўцы зборніка дакументаў аб акупацыйнай палітыцы гаўляйтэра В. Кубэ [10, 52]. У 2003 г. у г. Маскве выйшаў зборнік «Дакументы па гісторыі і культуры яўрэяў у архівах Беларусі», у падрыхтоўцы якога актыўны ўдзел прынялі супрацоўнікі Дзяржаўнай архіўнай службы Рэспублікі Беларусь. У снежні 2004 г. у НАРБ адбылася прэзентацыя кнігі «Савецкія і нямецкія ваеннапалонныя ў гады Другой сусветнай вайны» і даведніка «Лагеры савецкіх ваеннапалонных у Беларусі. 1941—1944 гг. », якія сталі вынікам сумеснай беларуска-нямецкай працы ў дадзеным накірунку [11, 134]. Вынікам супрацоўніцтва архівістаў Беларусі з Інстытутам імя Людвіга Больцмана (Аўстрыя) у галіне даследаванняў наступстваў войнаў з’яўляецца выданне даведнікаў «Дакументы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь», «Прымусовая праца беларускага насельніцтва ў Аўстрыі: Дакументы і матэрыялы». Іншая група даведнікаў адлюстроўвае інфармацыю пра дакументы па гісторыі Беларусі ў архівах замежных краін. Па выніках навуковых камандзіровак у архівы Масквы, Санкт-Пецярбурга, Вільнюса, Кіева, Львова падрыхтаваны даведнікі па фондзе Радзівілаў у Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы, фондзе Канцылярыі заходнерускіх мітрапалітаў у Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве [3, 35]. Падрыхтоўкай даведніка па фондах, што тычацца гісторыі Беларусі, займаліся ўкраінскія спецыялісты.

Традыцыйнай формай міжнароднага супрацоўніцтва стала арганізацыя сумесных выстаў. З 27 мая па 3 ліпеня 2002 г. у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі экспанавалася выстава «Ёсць на карце месца. Грамадска-культурнае жыццё беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі. 1921—



1938», падрыхтаваная Расархівам і Белкамархівам [4, 1]. У час міжнароднага семінара «Беларусь і Тадэвуш Касцюшка: спадчына, час і здабыткі», які працаваў у 2000 г. на гістарячным факультэце БДУ, была арганізавана выстава «Славутыя постаці Беларусі» з найноўшых дакументаў, якія захоўваюцца ў архівах Беларусі і Польшчы [12, 143].

Нягледзячы на шматлікія праблемы, з якімі ў пачатку 1990-х гг. сутыкнуліся архівісты, наладжванне кантактаў з замежжам мела свае практычныя вынікі: праведзены шматлікія навукова-практычныя канферэнцыі і семінары, арганізаваны даведачныя выданні па архіўных дакументах, наладжаны выставы. Таксама адбываўся абмен спецыялістамі. У пашырэнні і паглыбленні міжнародных сувязей гісторыкі-архівісты зацікаўлены і сёння.

## ЛІТАРАТУРА


1. Тарасов, В. П. Проблемы архивного сотрудничества в рамках СНГ / В. П. Тарасов // Архівы Беларусі на рубяжы XX—XXI стст. : гісторыя, стан, перспектывы развіцця: Міжнарод. навук.-практ. канф., Мінск, 8—9 лют. 2000 г. / склад. : У. І. Адамушка [і інш.]. Мінск : БелНДІДАС, 2001. 196 с.

2. Носевич, В. Встреча архивистов во Львове / В. Носевич // Архівы і справаводства. 2005. №6. С. 6—8.

3. Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы: бібліягр. паказ. (1997—2001) / БелНДІДАС; склад. : В. І. Саітава [і інш.]. Мінск : БелНДІДАС, 2001. 112 с.

4. Справка о выполнении плана совместных действий Федеральной архивной службы России и Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь за 2001—2003 гг. (Бягучы архіў Белкамархіва).

5. Архівы і справаводства. 2003. № 3. С. 129.

6. Тамсама. 2002. № 4. С. 133.

7. Міхальчанка, А. У інфармацыйным грамадстве архівісты будуць аднымі з самых запатрабаваных спецыялістаў / А. Міхальчанка // Архівы і справаводства. 2000. №6. С. 85—89.

8. Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты) / Матэрыялы Міжнарод. навук. канф. Мінск, 19—20 чэрв. 1997 г. Мінск, 1997.

9. Міхальчанка, А. Пытанні, якія патрабуюць адказаў / А. Міхальчанка, В. Насевіч // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 4. С. 43—44.

10. Селеменев, В. Д. Научно-информационная деятельность Национального архива Республики Беларусь / В. Д. Селеменев // Архівы на шляху ў XXI ст.: гісторыя, спадчына, сучаснасць : матэрыялы Другога беларуска-французскага архіўнага семінара. Мінск, 8—10 лют. 2000 г. / пад. рэд. К. І. Козака [і інш.]. Мінск, 2003. С. 52—53.

11. Архівы і справаводства. 2005. № 1. С. 134.

12. Тамсама. 2001. № 1. С. 143.

13. Справаздача БелНДІДАС аб навукова-даследчай рабоце за 1997 г. 30 с. (Бягучы архіў БелНДІДАС).